**Стылі камунікацыі: практыкаванне на самаацэнку**

*(Паводле працы П. Кейса „Навучанне для міжкультурнага мыслення“*
*Вашынгтон, SIETAR, 1981)*

**Інструкцыя:** калі ласка, выберыце з кожнай пары прыкмет найбольш тыпічную для вас. Пары не прадугледжваюць пазіцыі "альбо адно - альбо другое". Выбірайце як мага больш спантанна. Няправільных адказаў няма.

1. Мне падабаецца дзеянне.
2. Я вырашаю праблемы пры дапамозе сістэматычнага падыходу.

3. Я лічу, што каманды больш эфектыўныя, чым індывідуумы.
4. Мне вельмі падабаецца інавацыя.

5. Мяне больш цікавіць будучыня, чым мінулае.
6. Мне падабаецца працаваць з людзьмі.

7. Мне падабаецца наведваць добра арганізаваныя групавыя сустрэчы.
8. Тэрміны выканання задач важныя для мяне.

9. Я не цярплю пракрастынацыі.
10. Я лічу, што новыя ідэі трэба выпрабоўваць перад выкарыстаннем.

11. Мне падабаецца ўплыў ад узаемадзеяння з іншымі.
12. Я заўседы шукаю новыя магчымасці.

13. Я хачу ставіць свае ўласныя мэты.
14. Калі я пачынаю што-небудзь, я даводжу гэта да канца.

15. У асноўным я спрабую зразумець эмоцыі іншых людзей.
16. Я стаўлю няпростыя задачы людзям вакол сябе.

17. Я чакаю зваротнай сувязі наконт маей дзейнасці.
18. Я лічу крокавы падыход вельмі эфектыўным.

19. Я лічу, што ў мяне добра атрымліваецца чытаць людзей.
20. Мне падабаецца крэатыўнае вырашэнне праблем.

21. Я ўвесь час нешта пралічваю і праектую.
22. Я вельмі добра адчуваю патрэбы іншых.

23. Планаванне - ключ да поспеху.
24. Я губляю цярпенне пры доўгіх дыскусіях.

25. Я спакойны (спакойная) пад ціскам.
26. Я вельмі цаню досвед.

27. Я слухаю людзей.

28. Кажуць, што я хутка мыслю.

29. Узаемадзеянне - driven ключавое слова для мяне.
30. Я ўжываю лагічныя метады для выпрабоўвання альтэрнатыў.

31. Я люблю займацца некалькімі праектамі адначасова.
32. Я заўсёды пераправяраю сябе.

33. Я вучуся тады, калі я нешта раблю.
34. Я веру, што мой розум кіруе маім сэрцам.

35. Я магу прадказаць, як іншыя зрэагуюць на пэўныя дзеянні.
36. Мне не падабаюцца дэталі.

37. Аналіз павінен заўсёды папярэднічаць дзеянню.
38. Я магу ацаніць клімат групы.

39. У мяне ёсць тэндэнцыя пачынаць нешта і не заканчваць.
40. Я ўспрымаю сябе як рашучага чалавека.

41. Я шукаю няпростыя задачы.
42. Я разлічваю на назіранне і даныя.

43. Я магу адкрыта выказваць свае пачуцці.
44. Мне падабаецца распрацоўваць новыя праекты.

45. Мне вельмі падабаецца чытаць.
46. Я ўспрымаю сябе як фасылітатара.

47. Я не люблю канцэнтравацца на некалькіх пытаннях адначасова.
48. Мне падабаюцца дасягненні.

49. Я люблю вывучаць іншых людзей.
50. Мне падабаецца разнастайнасць.

51. Факты гавораць самі за сябе.
52. Я выкарыстоўваю фантазію як мага часцей.

53. Я губляю цярпенне, выконваючы доўгія марудныя заданні.
54. Мой розум ніколі не перастае працаваць.

55. Ключавыя рашэнні павінны прымацца вельмі асцярожна.
56. Я цвёрда веру, што людзі патрэбны адно аднаму, каб штосьці зрабіць.

57. Звычайна я прымаю рашэнні не доўга думаючы.
58. Эмоцыі ствараюць праблемы.

59. Я люблю падабацца іншым.
60. Я вельмі кемлівы (кемлівая).

61. Я выпрабоўваю свае новыя ідэі на людзях.
62. Я веру ў навуковы падыход.

63. Я люблю, каб дзейнасць мела вынік.
64. Добрыя адносіны - гэта самае галоўнае.

65. Я імпульсіўны (імпульсіўная).
66. Я прымаю адрозненні паміж людзьмі.

67. Камунікацыя з людзьмі - гэта і ёсць асноўная мэта.
68. Я люблю атрымліваць пажыву для розуму.

69. Мне падабаецца арганізоўваць.
70. Звычайна я пераскокваю з адной задачы на другую.

71. Размовы і праца з людзьмі - гэта творчае мастацтва.
72. Самаарэалізацыя - ключавое слова для мяне.

73. Я люблю гуляць з ідэямі.
74. Я не люблю марнаваць час.

75. Я люблю рабіць тое, што ў мяне добра атрымліваецца.
76. Я вучуся тады, калі ўзаемадзейнічаю з іншымі.

77. Мне падабаюцца і здаюцца цікавымі абстракцыі.
78. У мяне хапае цярпення на дэталі.

79. Я люблю сціслыя слушныя меркаванні.
80. Я адчуваю ўпэўненасць у сваіх сілах.

**Ліст падліку балаў для ацэнкі стыляў камунікацыі.**

**Інструкцыя:** абвядзіце выбраныя пункты і складзіце вынікі для кожнага стылю (адзін бал за кожны адказ). Максімум - 20 балаў на адзін **стыль**, агульны вынік для 4 стыляў павінен быць роўны 40 балам.

| Стыль | Абвядзіце свой адказ | Агульны лік (максімум 20) |
|---|---|---|
| **Стыль 1** | | |
| | 1 - 8 - 9 - 13 - 17 - 24 - 26 - 31 - 33 - 40 - 41 - 48 - 50 - 53 - 57 - 63 - 65 - 70 - 74 - 79 | ____________ |
| **Стыль 2** | | |
| | 2 - 7 - 10 - 14 - 18 - 23 - 25 - 30 - 34 - 37 - 42 - 47 - 51 - 55 - 58 - 62 - 66 - 69 - 75 - 78 | ____________ |
| **Стыль 3** | | |
| | 3 - 6 - 11 - 15 - 19 - 22 - 27 - 29 - 35 - 38 - 43 - 46 - 49 - 56 - 59 - 64 - 67 - 71 - 76 - 80 | ____________ |
| **Стыль 4** | | |
| | 4 - 5 - 12 - 16 - 20 - 21 - 28 - 32 - 36 - 39 - 44 - 45 - 52 - 54 - 60 - 61 - 68 - 72 - 73 – 77 | ____________ |

**Чатыры стылі камунікацыі**

| **Стыль 1: ШТО** | **Стыль 2: ЯК** |
|---|---|
| **ДЗЕЯННЕ** (Д)<br><br>Вынікі<br>Мэты<br>Дасягненні<br>Дзейнасць | **ПРАЦЭС** (ПР)<br><br>Стратэгіі<br>Арганізацыя<br>Факты |
| **Стыль 4: ЧАМУ** | **Стыль 3: ХТО** |
| **ІДЭЯ** (І)<br><br>Канцэпты<br>Тэорыі<br>Інавацыя | **ЛЮДЗІ** (Л)<br><br>Камунікацыя<br>Адносіны<br>Камандная праца |

**Асноўныя характарыстыкі стыляў камунікацыі**

| **Стыль** | **Змест** – у гаворцы людзей з такім стылем прысутнічаюць... | | **Працэс** - людзі с такім стылем... |
|---|---|---|---|
| **Дзеянне (Д)** | Вынікі | Адказнасць | Прагматычныя (цвяроза мысляць) |
| | Мэты | Зваротная сувязь | Прамыя (размаўляюць по сутнасці) |
| | Паказчыкі | Досвед | Нецярплівыя |
| | Прадукцыйнасць | Выклікі | Рашучыя |
| | Гаспадарлівасць | Дасягненні | Хуткія (пераскокваюць з адной ідэі на другую) |
| | Рух наперад | Перамены | Энергічныя (ставяць іншым няпростыя задачы) |
| | Рашэнні | | |
| **Працэс (П)** | Факты | Эксперыменты | Сістэматычныя (ужываюць крокавы падыход) |
| | Працэдуры | Аналіз | Лагічныя (улічваюць прычыны і вынікі) |
| | Планаванне | Назіранні | Разлічваюць на факты |
| | Арганізацыя | Доказы | Гаваркія |
| | Кантроль | Дэталі | Неэмацыйныя |
| | Выпрабоўванне | Асцярожнасць | Цярплівыя |
| **Людзі (Л)** | Людзі | Самаўдасканаленне | Спантанныя |
| | Патрэбы | Чуллівасць | Эмпатычныя |
| | Матывацыя | Усвядомленасць | Цёплыя |
| | Камандная праца | Узаемадзеянне | Суб'ектыўныя |
| | Камунікацыя | Перакананні | Эмацыйныя |
| | Пачуцці | Каштоўнасці | Праніклівыя |
| | Камандны дух | Чаканні | Чуллівыя |
| | Разуменне | Адносіны | |
| **Ідэя (І)** | Канцэпты | Што новага ў галіне | Маюць багатую фантазію |
| | Інавацыі | Творчасць | Харызматычныя |
| | Узаемазалежнасць | Шансы | Цяжка паддаюцца разуменню |
| | Новыя шляхі | Магчымасці | Эгацэнтрычныя |
| | Новыя метады | Грандыёзныя праекты | Нерэалістычныя |
| | Паляпшэнні | Праблемныя пытанні | Творчыя |
| | Праблемы | Патэнцыял | Поўныя ідэй |
| | | Альтэрнатывы | Паводзяць сябе правакацыйна |

**Адаптацыя да іншых стыляў камунікацыі**

**Камунікацыя з чалавекам, арыентаваным на Дзеянне (Д):**

- Арыентуйцеся ў першую чаргу на вынік; сфармулюйце выснову ў самым пачатку.
- Прапануйце лепшы, на ваш погляд, варыянт, без альтэрнатыў.
- Размаўляйце як мага карацей.
- Падкрэслівайце практычную каштоўнасць вашых ідэй.
- Карыстайцеся нагляднымі матэрыяламі.

**Камунікацыя з чалавекам, арыентаваным на Працэс (П):**

- Размаўляйце дакладна, канстатуйце факты.
- Арганізуйце абмеркаванне ў лагічным парадку:
    - Гісторыя пытання
    - Цяперашняя сітуацыя
    - Вынік
- Разбівайце прапановы на часткі.
- Уключайце варыянты і альтэрнатывы з усімі плюсамі і мінусамі.
- Не прыспешвайце чалавека, арыентаванага на працэс.
- Зрабіце план вашай прапановы.

**Камунікацыя з чалавекам, арыентаваным на Людзей (Л):**

- Паразмаўляйце на агульныя тэмы, не пачынайце абмеркаванне адразу.
- Падкрэсліце адносіны паміж вашай прапановай і зацікаўленымі людзьмі.
- Пакажыце, што гэтая ідэя добра працавала ў мінулым.
- Пакажыце падтрымку з боку паважаных людзей.
- Выкарыстоўвайце нефармальны **стыль** пісьма.

**Камунікацыя з чалавекам, арыентаваным на Ідэю (І):**

- Плануйце дастаткова часу для абмеркавання.
- Не губляйце цярпення, калі ён ці яна адхіляецца ад асноўнай тэмы.
- Паспрабуйце звязаць тэму, што вы абмяркоўваеце, з больш шырокай канцэпцыяй або ідэяй.
- Падкрэслівайце унікальнасць ідэі або тэмы, якую вы абмяркоўваеце.
- Падкрэслівайце будучую каштоўнасць, або звязвайце ўплыў ідэі з будучыняй.
- Калі вы пішаце, паспрабуйце ў самым пачатку падкрэсліць ключавыя паняцці, якія ляжаць у аснове вашай прапановы. Пачынайце з агульнай фармулёўкі і рухайцеся да дэталяў.